Інфармацыйны праект "ВОКА"
на старонках ZABEJ.INFO

# ВОКА

№3

# "Хочам вучыцца па-беларуску!"


2005 год



2006 год


2007 год

1-га верасня 2008 Дзень ведаў.

Традыцыйна ў гэтыя першыя дні вучобы маладыя людзі з розных ініцыятыў праводзяць інфармацыйную кампанію "Хочам вучыцца па-беларуску!", мэтай якой з'яўляецца прыцягненне ўвагі да праблем русіфікацыі беларускіх школ ды ўніверсітэтаў.

Упершыню гэта кампанія адбылася ў Мінску першага верасня 2004 года, тады некалькі дзесяткаў маладых людзей выйшлі на Кастрычніцкую плошчу беларускай сталіцы з падручнікамі роднай мовы і з сімвалічна залепленымі ртамі, аднак гэты адчаяны пратэст моладзі быў на караню прыціснуты супрацоўнікамі беларускай міліцыі.

Заснавальнікамі кампаніі былі Мі "ВОКА", "ЗБС", навучэнцы ліцэя імя Я.Коласа, але за чатыры гады да кампаніі далучыліся многія маладзёвыя арганізацыі ды рухі ("Моладзь БНФ", "Ініцыятыва", "Трэці Шлях", "Гарт" і інш.).

На пачатку 2006 года абмяркоўвалася пытанне аб скасаванні вывучэння беларускай мовы ў ВНУ і ПТВ, а ў жніўні стала вядома, што гісторыю Беларусі зараз у 10-х і 11-х класах пачнуць вывучаць па-руску. Пачатак 2007 года прынёс нерадужныя навіны: у беларускіх школах былі забаронены для вывучэння многія творы знакамітых пісьменнікаў, у тым ліку і класіка беларускай літаратуры - п'еса Янкі Купалы "Тутэйшыя".
17 чэрвеня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісал дыкрэт №15 " Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі".

Рэформа ў сістэме адукацыі закранае кожнага шкаляра, кожнага настаўніка і бацькоў.
Міністэрства адукацыі зноў вырашыла вярнуцца да 9 і 11 класаў. Школьнікі з 1 верасня 2008 года будут навучацца 5 дзён, а ў суботу будут праводзіцца факультатыўныя заняткі, але вучням выпускных класаў прыйдзецца навучацца 6 дзён.

Згодна з новымі правіламі ў дзяцей крадуць самые важкія прадметы. Перш за ўсё гэта датычыцца выкладання ў агульнаадукацыйным курсе "Гісторыі Беларусі". З 1 верасня 2008 года гісторыя Беларусі будзе ўключана ў курс сусветнай гісторыіі, а дысцыпліна будзе называцца проста "Гісторыя".

"Штогод мы губляем больш за 100 беларускамоўных школ па ўсёй рэспубліцы, асабліва падае іх колькасць у вёсцы", зазначыў А.Лозка.

ХОЧАМ ВУЧЫЦЦА ПА-БЕЛАРУСКУ!



Эксперт:

# "Праз 20 гадоў у Беларусі не застанецца беларускіх школаў"

**Напярэдадні новага навучальнага году Міхась Скобла гутарыць са старшынём Таварыства беларускай школы, выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага пэдагагічнага ўнівэрсытэту імя Максіма Танка Алесем Лозкам.**

**Міхась Скобла: "Спадар Алесь, нядаўна Міністэрства адукацыі адрапартавала: стан усіх школаў у нашай краіне "добры ці здавальняючы": можна пачынаць новы навучальны год. А які ў нас стан зь беларускамоўнай школьнай адукацыяй?"**

Алесь Лозка: "Сытуацыя на сёньня такая: у школах зь беларускай мовай навучаньня займаецца 20,9% ад усіх школьнікаў. У 2004 іх было 24, 8%, у 2005 - 23,8%, у 2006 - 23, 3%, у 2007 - 21,5%, і сёньня, як я ўжо сказаў, толькі 20, 9%. Такім чынам, дынаміка выразная: штогод колькасьць беларускіх школаў зьмяншаецца прыблізна на адзін адсотак. Калі гэткая тэндэнцыя захаваецца, то ўсяго праз дваццаць гадоў у Беларусі не застанецца ніводнай беларускай школы. Мы не павінны гэтага дапусьціць. Нібы саромеючыся прыведзеных вышэй лічбаў, Мінадукацыі на сваім афіцыйным сайце падае статыстыку толькі двухгадовай даўніны - за 2005/2006 навучальны год. Названыя лічбы падводзяць нас да крытычных межаў існаваньня нацыі. Па вызначэньні UNESCO, нацыя знаходзіцца на мяжы зьнікненьня, калі на роднай мове навучаюцца менш за 30% дзяцей. А мы ўжо даўно перасягнулі гэтую мяжу".

**Скобла: "Памятаю, нехта з чыноўнікаў Мінадукацыі "пажартаваў" у інтэрвію. Маўляў, "не перажывайце вы так за беларускія школы! Чым больш мы іх зачыняем, тым больш абітурыентаў на ўступных іспытах здае тэсты па-беларуску". Гэта праўда?"**

Лозка: "З аднаго боку, сапраўды, так і адбываецца. Абітурыенты выбіраюць найчасьцей беларускую мову, і гэтая лічба апошнім часам трошкі ўзрастае. У прадчуваньні нацыянальнай трагедыі ў народзе больш выразна сталі праяўляцца нацыянальныя пачуцьці й пратэстныя ўчынкі, асабліва ў моладзі. Штогод павялічваецца колькасьць тых, хто жадае здаваць тэсты па беларускай мове (летась - 87 000 абітурыентаў), у той час, як колькасьць выпускнікоў беларускіх школаў памяншаецца (каля 20 000 у мінулым годзе). Сёлета ўжо гэтыя паказчыкі зьменшыліся прыблізна на 3%. Затое тэсты па-беларуску здалі лепш, чым па-расейску: кожны трэці іспыт па расейскай мове завалены. Па гісторыі на беларускай мове праходзілі тэставаньне ў 2007 годзе 27 490 чалавек з 37 717 усіх абітурыентаў, сёлета - 22 тысячы з 28 479. Што да колькасьці абітурыентаў, якія абралі іспыты на роднай мове, то іх сёлета было 4%. І гэта нягледзячы на тое, што Міністэрства адукацыі перавяло выкладаньне гісторыі й геаграфіі на расейскую мову.

Гэтыя "аптымістычныя" паказчыкі я тлумачу тым, што яшчэ ня скончыўся паток дзяцей, якія пачыналі навучаньне ў школах зь беларускай мовай навучаньня. Яны яшчэ дыхалі паветрам свабоды, а сёньня гэтыя школьнікі ў выпускных клясах. І беларушчына ў іхніх душах засталася. Але з боку міністэрскага чыноўніка жарт выглядае цынічна. Міністэрства адукацыі павінна выконваць свае наўпроставыя функцыі - выхоўваць грамадзянаў незалежнай Беларусі, а не праводзіць русіфікацыю".

**Скобла: "Сёлета ўпершыню за многія гады пры паступленьні на філялягічны факультэт БДУ не было конкурсу. Ледзьве набралі патрэбную колькасьць студэнтаў. Чаму прафэсія настаўніка становіцца ўсё больш непрэстыжнай?"**

Лозка: "Так, сапраўды, сёлета былі вельмі малыя конкурсы. Ажно ў адзінаццаці вышэйшых навучальных установах быў недабор на многія спэцыяльнасьці. Прычым, ня толькі на беларусазнаўчыя, але й на гісторыю, на ангельскую мову, на матэматыку, на фізыку. Чаму прафэсія пэдагога робіцца непрэстыжнай? А паглядзіце, якія ў настаўнікаў заробкі. У два-тры разы меншыя, чым у міліцыянтаў! Дзяржава ўвесь час эканоміць на настаўніках! Гэта адно. А другая прычына адсутнасьці конкурсаў у тым, што перад гэтым з высокіх трыбунаў было заяўлена, што гадзінаў у школах будзе менш, што дванаццатая кляса ў школах проста адмяняецца.

Між іншым, цікавы факт: як мы ведаем, з гэтага навучальнага году ў школах зусім ня будзе гэткага прадмету, як "Усясьветная мастацкая культура". А наборы ў некаторых ВНУ на гэтую спэцыяльнасьць, як ні дзіўна, адбыліся! Напрошваецца пытаньне: што будучыя культуразнаўцы будуць выкладаць? Хутка ў нас у Пэдагагічным унівэрсытэце імя Максіма Танка пачнуцца заняткі, і мы, паводле навучальнага пляну, павінны будзем накіроўваць студэнтаў у

школы на практыку. А куды накіроўваць, калі такога прадмету няма?! Дарэчы, пасьля гэтай псэўдарэформы ўзьнікла столькі праблемаў, столькі нявырашаных пытаньняў! Беларускія настаўнікі яшчэ схопяцца за галаву пасьля 1 верасьня".

**Скобла: "Вы згадалі пра скасаваны прадмет - усясьветную мастацкую культуру. А ці так ужо патрэбная яна ў звычайнай агульнаадукацыйнай школе?"**

Лозка: "Вельмі патрэбная, асабліва нам, беларусам. Паглядзіце, у школах розных краінаў такі прадмет прысутнічае. Вазьміце Расею, там усясьветную мастацкую культуру вывучаюць. Кіраўніцтва Беларусі ня раз заяўляла, што Беларусь будзе інтэгравацца з Расеяй, браць зь яе прыклад. Дык вазьміце! У Расеі ёсьць гэты прадмет, а ў нас няма".

**Скобла: "Яшчэ адна заганная тэндэнцыя ў сфэры адукацыі: у беларускамоўных школах пачалі зьяўляцца расейскамоўныя клясы. Да чаго гэта можа прывесьці?"**

Лозка: "Сапраўды, такое мае месца. Скажам, існуе беларускамоўная школа. І тут нейкаму чыноўніку хочацца стварыць у ёй расейскамоўную клясу. Ствараюць. І - праз некаторы час школа цалкам пераводзіцца на расейскамоўны рэжым. Так летась адбылося ў горадзе Глыбокім з СШ № 2. Так адбываецца па ўсёй Беларусі. І ў Менску таксама. Напрыклад, СШ № 190 была беларускамоўнай, стварылі расейскамоўную першую клясу, потым - другую, трэцюю, і - пайшло-паехала. Мы з гэтым, як можам, змагаемся".

**Скобла: "Рыхтуючыся да перадачы, я са зьдзіўленьнем даведаўся, што ў Беларусі існуе дзяржаўная "Праграма мераў па пашырэньні сфэры выкарыстаньня беларускай мовы ў сыстэме адукацыі", зацьверджаная пастановай Міністэрства адукацыі ад 27 жніўня 2002 году. Аказваецца, ужо шэсьць гадоў дзейнічае адмысловая праграма. Ці ня дзейнічае?"**

Лозка: "На жаль, гэтая праграма зусім ня дзейнічае. Але яна ёсьць, і яе ніхто не адмяняў. Праграма, дарэчы, нядрэнная, і калі б яна выконвалася, то праблемаў зь беларускамоўным навучаньнем у нас не было б. Але чыноўнікі ад адукацыі робяць выгляд, што такой праграмы няма".

**Скобла: "Каб не выконвалася адна дзяржаўная праграма, павінна быць нейкая контрпраграма, сфэра адукацыі - гэта ж сыстэма, дзе дзейнічаюць цыркуляры ды распараджэньні. Ці існуе нейкі дакумэнт, які дазваляе не выконваць праграму па падтрымцы роднай мовы?"**

Лозка: "Магчыма, існуе, таму што пішуцца, часта ў таямніцы ад грамадзтва, новыя законы. Беларускае заканадаўства ўвогуле вельмі няпэўнае, многія нарматыўныя акты можна па-рознаму трактаваць. Часам чыноўнікі гэтым карыстаюцца й ўпарта, быццам выконваюць чыёсьці заданьне, пераводзяць нашу школу на расейскія рэйкі".

***Скобла: "Як ужо было сказана, апошнім часам выкладаньне гісторыі Беларусі ў беларускіх школах мае адбывацца па-расейску. Выказацца на гэтую тэму я папрасіў настаўніка гісторыі Давыд-Гарадоцкай СШ №1 Віктара Вабішчэвіча".***

*Віктар Вабішчэвіч: "І настаўнікі, і вучні пераважна адмоўна ставяцца да фактычнага загаду перавесьці выкладаньне гісторыі на расейскую мову. Мы атрымліваем расейскамоўныя падручнікі й проста абавязаныя выкладаць па-расейску. Гэта, вядома, удар па гісторыі Беларусі. Але ў першую чаргу, калі глядзець з пункту погляду той самай дзяржаўнай ідэалёгіі, гэта ўдар па беларускай дзяржаўнасьці й самой ідэалёгіі. Усе прывыклі, што гісторыю свайго краю, гісторыю Беларусі, мы вывучаем на роднай мове. Гэта натуральна. А цяпер што з тэрмінамі рабіць? Як пісаць у тэстах - вальны сойм? Ці ламаць словы на расейскі манер? Узьнікае вельмі шмат пытаньняў, пра якія, па-мойму, ніхто ня думае".*

***Скобла: "А што чуваць з "інтэграваным курсам гісторыі"? Ці ўдаецца спалучыць гісторыю Беларусі з гісторыяй, скажам, Кітаю? Якія тут посьпехі?"***

*Вабішчэвіч: "На шчасьце, пакуль што гісторыя Беларусі заставалася асобным прадметам. Пакуль што мы ставілі дзьве адзнакі. Мабыць, дзякуючы таму, што ёсьць пакуль дзяржаўны іспыт па гісторыі Беларусі. Але тое, што зроблена з гэтага навучальнага году, калі два прадметы запісаныя адным радком, і мы вывучаем пасьлядоўна, спачатку ўсеагульную гісторыю, а потым гісторыю Беларусі, гэта бязглуздзіца. Асабліва складана даводзіцца настаўнікам. Думаю, што наша роднае Міністэрства адукацыі само праз пару гадоў зразумее, што з аб"яднанай гісторыяй намудрагеліла, і запіша так, як і было раней: гісторыя Беларусі - 1 гадзіна, усясьветная гісторыя - 1 гадзіна на тыдзень. Я думаю, што ў Беларусі знойдуцца нейкія сілы, якія зразумеюць, што нашай краіне патрэбная гісторыя Беларусі".*

**Скобла: Спадар Алесь, зыходзячы з усяго вышэйсказанага, напярэдадні новага навучальнага году мы ўсё ж павіншуем беларускіх настаўнікаў, ці паспачуваем ім?"**

Лозка: "Павіншаваць можна, але й паспачуваць трэба, безумоўна. Пасьля 1 верасьня самі настаўнікі зразумеюць сваё незайздроснае становішча. Вяртаньне да адзінаццацігодкі так эмацыйна ўспрымалася ў грамадзтве, бацькі нібыта з палёгкай уздыхнулі: на год менш трэба будзе выпраўляць дзяцей у школу. Але мы больш згубім, чым набудзем. У нас у Беларусі школьная адукацыя, трэба сказаць, была нядрэннай. А цяпер мы будзем адставаць ад другіх краінаў сьвету. Дарэчы, тая самая Расея заявіла, што дзесьці ў 2010 годзе яны пяройдуць на дванаццацігодку. У цывілізаваных краінах, нават у Кітаі навучаньне ў школах працягваецца дванаццаць гадоў, гэта міжнародны стандарт. У сьвеце ўсе пераходзяць на дванаццацігодку, а Беларусь, наадварот, адыходзіць ад стандартаў. Гэта нам яшчэ адгукнецца. Крызіс у адукацыі - прадвесьнік агульнага крызісу ў краіне. А нашыя ўлады ў галіне адукацыі сёньня дзейнічаюць паводле народнай прымаўкі: "Акуля, што шыеш не адтуля?" - "А я, матухна, яшчэ пароць буду".

**Міхась СКОБЛА, Радыё Свабода**

# Колькі каштуе “Дзень ведаў”?



**У верасні мой малодшы брат пойдзе ў першы клас. Ён ўжо носіцца са старым рукзаком сярэдняга і ўяўляе, як будзе сядзець за партай. Але бацькі не раздзяляюць ягонай радасці:іх хвалюе іншае - у колькі сёлета выльецца навучанне двух школьнікаў і аднаго студэнта?**

У час маёй матулі школа адрознівалася аднолькавымі ранцамі, абавязковымі карычневымі сукенкамі і фартухамі. Часы вяртаюцца, школьная форма ўжо стала часткай жыцця для многіх школьнікаў. Можна доўга спрачацца пра яе мэтазгоднасць, але грошы на школьнае адзенне спатрэбіцца даставаць па-любому: за парадны касцюм для першай лінейкі прыйдзецца аддаць ад 50 000, сарочку можна знайсці за 16 000, калі дадаць сюды абутак (ад 30 000), гальштук (5 000-6 000 руб.) і кветкі для настаўніцы (прыстойны букет каштуе ад 15 000), то адна толькі школьная лінейка будзе каштаваць ад 116 000 руб. І гэта толькі пачатак. Мінімальны набор школьных прыналежнасцяў першакласніка у Мінскім ЦУМе каштуе 75 000 руб. Плюс ранец (самы танны - 33800 руб.), спартовы касцюм (ад 50 000) і спартовы абутак ( ад 20 000). Першы клас майго малодшага брата абыдзецца як мінімум у 295 000 руб. бацькоўскіх грошаў.

На сто тысяч болей патрацяць бацькі адпраўляючы сынашасцікласніка. Парадныя штаны і пінжак ад - 100 000, сарочка (20 000) абутак (ад 55 000), гальштук (ад 8 000), спартовы касцюм і кеды (мін. 120 000). Канцылярскія тавары абыдуцца шасцікласніку ў тыя ж 70 000, што і першакласніку. Плюс аплата падручнікаў (недзе каля 20 000). Букет для настаўніцы - 15 000 і ў выніку дзень ведаў сярэдняга брата забярэ каля 410 000 руб. з бацькоўскага кашалька.

Але як кажуць, “маленькія дзеткі - маленькія бедкі”. Бацькам новаспечаных студэнтаў-платнікаў спатрэбіцца нямала “ўмоўных адзінак”. У гэтым навучальным годзе больш за ўсё будуць плаціць студэнты медуніверсітэта - ад 4 200 000 да 5 700 000 руб., аплата ў БДУ складзе ад 2 467 700 да 4 200 000 руб., студэнтам БДЭУ (былы “наргас”) -прыйдзецца знайсці ад 2 965 360 да 3 045 460 руб., у МДЛУ (былы “іняз”) 3 248 000, БНТУ- ад 2 420 540 да 3 200 000, у БДУІР (былы РТІ) - ад 2 750 000 да 2 900 000 і г.д.

Калі эйфарыя паступлення прайшла для іншагародніх студэнтаў паўстае пытанне жылля. Шчаслівчыкі, заселеныя ў інтэрнат, заплоцяць ад 15 000 да 20 000 руб., а тыя, каму месца ў інтэрнаце не засталося будуць вымушаны шукаць кватэру ці пакой. Па дадзеным агенцтва нерухомасці “Твая сталіца” кошт аднапакаёвай кватэры па розных раёнах Мінску складае ад 230 да 430 у.а., двухпакаёвай - ад 280 да 480 у.а., трохпакаевай - ад 300 да 480 у.а. у месяц. Можна зняць асобны пакой. кошты ў такім выпадку будуць значна меншыя. Калі не атрымоўваецца шукаць самому, дапамогуць агенцтвы за суму прыкладна ў 170 000 руб.

Маладому хлапцу (дзяўчыне), натуральна, патрэбна рухацца па горадзе. ездзіць дамоў . Перамяшчэнні па Мінску абыдуцца ў 23 670 у месяц (менавіта столькі каштуе праязны на адзін від транспарту). Каб наведаць бацькоў, што ў Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці, я, напрыклад. Трачу 22 000 руб. на дарогу “туды і назад”. Мой знаёмы з Полацку у два разы больш.

Калі ты не навучаешся за кошт бюджэту, то дзень ведаў для цябе будзе каштаваць ад 3 000 000.

Такім чынам навучанне мяне і маіх братоў выльецца бацькам у круглую суму. Дзе іх узяць у нашай краіне, пытанне іншага артыкулу.

**Настасся ЗАНЬКО**

# Новая рэформа ў сферы адукацыі

Будучаму пакаленню нашай краіны не даюць развівацца і атрымліваць добрую ўсебаковую адукацыю. 17 чэрвеня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падпісал дыкрэт №15 " Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі".
Рэформа ў сістэме адукацыі закранае кожнага шкаляра, кожнага настаўніка і бацькоў. Міністэрства адукацыі зноў вырашыла вярнуцца да 9 і 11 класаў. Школьнікі з 1 верасня 2008 года будут навучацца 5 дзён, а ў суботу будут праводзіцца факультатыўныя заняткі, але вучням выпускных класаў прыйдзецца навучацца 6 дзён.
Згодна з новымі правіламі ў дзяцей крадуць самые важкія прадметы. Перш за ўсё гэта датычыцца выкладання ў агульнаадукацыйным курсе "Гісторыі Беларусі". З 1 верасня 2008 года гісторыя Беларусі будзе ўключана ў курс сусветнай гісторыіі, а дысцыпліна будзе называцца проста "Гісторыя". Адсюль можна зрабіць асноўны вынік кіраўніцтва нашай дзяржавы зусім не зацікаўлена ў станаўленні развітай моладзі, якая выхоўваецца на нацыянальных беларускіх традыцыях і зацікаўлена вывучэннем гісторыі сваёй Бацькаўшчыны. А праз пэўны час нікога не будзе здіўляць, што наш славуты дзеяч Францыск Скарына жыў у Піцеры, а самы таленавіты празаік Васіль Быкаў пісаў вершы.
Раіса Іванаўна, маці вучня 9 класа: "Такое адчуванне, што з нашых дзяцей жадаюць зрабіць звычайны "працоўны клас", людзей, якіх зусім не цікавіць культурная сфера жыцця. Як можна было ўбраць асобную дысцыпліну "Гісторыю Беларусі"?! Аднойчы нашым дзецям ужо скасавалі праграму па беларускай літаратуры і зараз моладзь выхоўваецца на іншых каштоўнасцях. Яны забываюць пра шчырыя чалавечыя адносіны, пяшчоту, дабрату. А гэта ўсё ідзе са школы. Вось і думайце якім мы ўбачым новае пакаленне."
Максім, вучань 11 класа: "Я нават не магу ўявіць якім будзе апошні год школьнай адукацыі. Складваецца ўраджанне, што Міністэрства адукацыі не цікавяць скаргі вучняў, бацькоў, настаўнікаў. Яны хацелі палепшыць сістэму, а атрымалася ўсё наадварот. Можна сказаць, што агульная адукацыя каціцца ўніз з вялікай хуткасцю і ад гэтага становіцца вельмі горка. Выпускнікі не ведаюць, якім чынам будзе арганізавана ўступная кампанія 2009, як вывучыць курс, які разлічаны на 2 гады за адзін і шмат іншых пытанняў. Цікавыя прадметы прыбіраюць, колькасць гадзін замежнай мовы скасоўваюць. Сёння 21 стагоддзе, а мне здаецца, што мы зрабілі некалькі крокаў назад".
Святлана Міхайлаўна, настаўнік сусветнай мастацкай культуры: "Новая рэформа падрывае ўсю сістэму адукацыі. Сусветная мастацкая культура выключана са школьнага курса. Мне невядома, што будзе з настаўнікамі, якія засталіся не патрэбнымі. Вельмі шкада дзяцей, якія застаюцца без цікавых дысцыплін. Беларусь - еўрапейская краіна, вучні якой не будуць вывучаць поўны курс гісторыі Беларусі. Адным словам, настаўнікі, школьнікі апынуліся ў сітуацыі поўнай разгубленасці, а славутае Міністэрства адукацыі ўвогуле не думае пра моладзь".
Карацей кажучы, невядома якія мэты ставіць Міністэрства адукацыі, калі падтрымлівае рэформу адукацыі. Немагчыма сказаць якім будзе наступнае пакаленне беларусаў 21 стагоддзя. Але кожнаму чалавеку варта падумаць што ён можа зрабіць каб змяніць сітуацыю ў лепшы бок. Самае галоўнае не баяцца выказваць свае думкі і адстойваць сваё правы на ўсебаковую развітую агульную адукацыю.

**Надзея СІНКЕВІЧ**



# Толькі 30% студэнтаў атрымаюць інтэрнаты

**У новым навучальным годзе ў Менску ня больш за 70% студэнтаў, якія маюць патрэбу ў жыльлі, будуць забясьпечаны інтэрнатамі.**

Як паведаміла начальнік упраўленьня разьвіцьця матэрыяльна-тэхнічнай базы Міністэрства адукацыі Лідзія Зайцава, у мінулыя гады месцы ў сталічных інтэрнатах атрымлівалі прыблізна 80% тых, хто меў патрэбу ў жыльлі. Сытуацыя некалькі пагоршылася пасьля прыняцьця рашэньня аб тым, што нароўні са студэнтамі бюджэтнай формы на месцы ў інтэрнатах могуць прэтэндаваць і платнікі. Акрамя таго, чатыры мінскія інтэрнаты закрыты на рэканструкцыю, у тым ліку інтэрнат БДУ на 1.200 месцаў. У найбліжэйшы час з эксплюатацыі выведуць яшчэ адзін інтэрнат БДУ на праспэкце Пераможцаў, разьлічаны на 600 месцаў.

«Сёлета праблему засяленьня ў інтэрнаты ўсіх студэнтаў, якія маюць патрэбу ў жыльлі, мы не вырашым», - падкрэсьліла спэцыяліст. Паводле яе слоў, у большасьці ВНУ правам першачарговага засяленьня будуць карыстацца ільготнікі і студэнты-выдатнікі. Тым, хто не зможа засяліцца ў інтэрнаты, з пошукам кватэры паспрабуюць дапамагчы студгарадкі.

Паводле слоў Л.Зайцавай, забясьпечанасьць студэнтаў інтэрнатамі ўзрасьце да 90% бліжэй да 2011 года, калі жыхароў прыме студэнцкая вёска. Першы яе будынак - інтэрнат БДУ на 1 тыс. 300 месцаў - ужо будуецца. На ўсе работы выдзелена 43 млрд. рублёў. Інтэрнат плянуецца здаць у 2009 годзе.

Як паведаміла Л.Зайцава, летась забясьпечанасьць інтэрнатамі ў Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце складала 80%, Беларускім нацыянальным тэхнічным унівэрсытэце - 60%, Беларускім дзяржаўным інстытуце інфарматыкі і радыёэлектронікі - 60%, Беларускім дзяржаўным эканамічным унівэрсытэце - 97%, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным унівэрсытэце - прыблізна 50%, Беларускім дзяржаўным пэдагагічным унівэрсытэце імя Максіма Танка - 43%. Міжнародны дзяржаўны экалягічны унівэрсытэт імя Андрэя Сахарава не меў уласнага інтэрнату.

Паводле слоў Л.Зайцавай, у рэгіёнах сытуацыя крыху лепш. Летась студэнты Гомельскага і Гарадзенскага дзяржаўных унівэрсытэтаў, што маюць патрэбу ў жыльлі, былі забясьпечаныя інтэрнатамі на 70%, Магілёўскага - на 90%, Віцебскага - на 100%. Стопрацэнтная забясьпечанасьць інтэрнатамі была таксама ў Полацкім і Баранавіцкім дзяржаўных унівэрсытэтах, Віцебскім дзяржаўным тэхналягічным, Берасьцейскім дзяржаўным тэхнічным унівэрсытэце і некаторых іншых рэгіянальных ВНУ.

БелаПАН

праект "студэнцкая вёска"



Інфармацыйны праект "ВОКА"
на старонках ZABEJ.INFO
www.moladz.org
admin@moladz.org